**Ігар Пракаповіч**

# Шляхі накanаванага бязмежжа

Вершы

Мінск
Мастацкая літаратура
1999

Пракаповіч Ігар Міхайлавіч нарадзіўся 9 снежня 1960 года ў г. Паставы Віцебскай вобласці.

Пасля заканчэння геаграфічнаіа факультэта БДУ працуе настаўнікам геаграфіі СШ № 1 г. Паставы.

Літаратурныя творы друкаваліся ў альманахах «Дзень паэзіі», «Дзвіна», «Рунь», у часопісах «Маладосць», «Вожык», у газетах. Выдаў кнігу паэзіі «Рэха малітваў». Аўтар кнігі «Фізічная геаграфія Пастаўскага раёна». Лаўрэат прэміі часопіса «Маладосць» (1993).

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

*Па свеце колькі ні блукай,*
*А ўсё адно — усе шляхі*
*Вядуць у ціхі родны край,*
*Дзе адпускаюцца грахі.*

УДК 882.6-1
ББК 84(4Беи)6
П 69
Серыя заснавана ў 1968 годзе
Прадмова
*Казіміра Камейшы*

**© І, М. Пракаповіч, 1999**

## «З ЦЯПЛОМ І ПРАЎДАЙ У ВАЧАХ...»

Гадоў колькі назад я знаёміўся з першай паэтычнай кнігай Ігара Пракаповіча «Рэха малітваў», што выходзіла ў дадатку да часопіса «Маладосць», і меў задавальненне ад таго, што адкрываю для сябе новага і цікавага паэта. Уражвалі перш за ўсё некатэгарычная разважлівасць, удумлівы, без гарэзлівых усхліпаў і маладога штукарства, погляд на рэчы. Пісаў аўтар пра ўсё тое ж, пра што сёння пішуць яго равеснікі. Словам, былі тыя ж нібы знаёмыя «малітвы», але зусім іншае, своеасаблівае рэха чулася ад іх нягучнага, традыцыйна прыцішанага прамаўлення.

З тым жа настроем чытаю я сёння і новую кнігу Ігара Пракаповіча «Шляхі наканаванага бязмежжа». Доўга і не буду шукаць прыкладаў. Спынюся на простым зімовым малюнку, дзе што ўжо можа быць новым, апроч снегу, падсіненага марознага ветру і неба. Вось чытаю:

Некрануты сум прасторы,
Як паперы чысты ліст.
Збоку — мроі, зверху — зоры,
Снег — падманшчык і артыст.

Два апошнія радкі быццам падрыхтаваны да нечаканага. А потым канцоўка:

Але цягне след па снезе
Пратаптаць які ўжо раз,
І па ім, як сонца ўскрэсне,

Адшукаюць нашы нас.

Згадзіцеся, крыху непрадказальна. Снег не для таго, каб ім любавацца і таптаць, а для таго, каб «адшукалі нашы нас». Вось так дасягаецца важкасць радка.

У новай кнізе І. Пракаповіча ёсць па-сапраўднаму хвалюючыя і ўражлівыя творы, падсвечаныя не толькі аўтарскім досціпам, але і напоўненыя болем, прапушчаным праз сэрца і ўзмоцненым ім. Боль гэты перадаецца і мне, чытачу. Працытуем колькі радкоў з верша пад той жа назвай «Боль»:

Час павярнуўся назад.
Будучае — у мінулым.
Чырвона-зялёнае
    ледзь паспела стаць
    бел-чырвона-белым...
Затое чырвонае
паспела стаць белым.
    Лейкемія.
Чаму ў беларусаў
народныя песні
    такія сумныя?
«Ой, сівы конь бяжыць...»
Белы конь надзеі стаў сівым.

Аўтарская ўзрушанасць і задушэўнасць маюць свой акцэнт, чым і прымушаюць звярнуць на сябе ўвагу.

Ігар Пракаповіч не абыякавы да таго зямнога хараства, між якога нарадзіўся і вырас. Але разам з адчуваннем гэтага хараства ў сэрцы паэта ўзнікае і трывога за яго знішчэнне. А за знішчэннем хараства прыроды заўсёды бачыцца і знішчэнне хараства душэўнага.

Падкрэслю яшчэ раз: толькі замілаванне, толькі замалёўкі для аўтара недастаткова. І калі, скажам, ён углядаецца ў вечаровыя хвалі непаўторнага возера Мястра, дзе часта рассыпана «ззянне зор», то ў першую чаргу бачыць і чуе саму гісторыю роднага краю, увасобленую ў захапляльнай легендзе.

«Голас душы» паэта амаль ніколі не зрываецца на крык, але сіла яго ў тым, што мы яго чуем. Мабыць, таму і жаданне «Пражыць не пасынкам, а сынам з цяплом і праўдай у вачах» гучыць для нас зусім не дэкларатыўна, а мае свой гуманны чалавечы сэнс.

Засяродзіўшыся на вершах грамадскага рыштунку Ігара Пракаповіча, неяк зусім нязвыклым здаецца пераход да інтымнай лірыкі паэта, дзе побач з яркімі і ўсхваляванымі радкамі не абыходзіцца і без моднай сёння салоннасці, «свечак» ды «кавы», а то і сноў («Спі, мілая...»).

Але як звыкла сёння казаць — кніга адбылася, кніга ёсць, «прахадных» старонак у ёй шукаць не даводзіцца. Пажадаем жа ёй шчаслівага шляху да чытача.

*Казімір Камейша*

## *ШЛЯХ ЗАСНЕЖАНАЙ АЙЧЫНЫ*

* * *

Радзіма...
Дарога мая і прытулак.
Надзейнае сонца,
Што свеціць і ўдзень, і ўначы.
Дзівосная сіла
У сховах лясоў і рачулак
Нібы магніт мяне вабіць,
Каб мучыць ізноў
                і лячыць...

## НАСТАЛЬГІЯ

Апошнім часам
самымі глухімі начамі,
калі дажджы лупцуюць зямлю
                за няведама якую кару
я прачынаюся
і доўга гляджу на цені на сцяне.
Хвіліны лічыць гадзіннік.
Перада мною плывуць стагоддзі,
палаюць вогнішчы,
граюць трубы,
развяваюцца харугвы з выявай «Пагоні»
Нейкае шчырае пачуццё
сціскае сэрца.
І я разумею, што імя яму —
        Настальгія.
                У мяне няма Айчыны...
                Я не знаю яе голасу,
                я не бачу яе постаці,
                я не адчуваю яе душы.
                Нават у коле сяброў...
Нават ля чыстай крыніцы...
І толькі начамі,
самымі глухімі начамі,
калі я прачынаюся
і доўга гляджу на цені на сцяне,
перада мной праплываюць стагоддзі,
палаюць вогнішчы,
граюць трубы,
развяваюцца харугвы «Пагоні».
І я разумею, што гэта —
        Настальгія...

* * *

Я паліваю вадою каменне і цэглу,
Я, як садоўнік, счышчаю з іх мох і пясок.
Я адчыняю таемныя дзверы у вечнасць,
Я спадзяюся, што з памяці вырасце мур.

Замкі паўстануць на месцах руінаў і бруду,
Рыцары вымуць са сховаў і похваў мячы.
Быццам маланкай на часткі расколецца неба
Зорка «Айчына» ўспыхне над нашай Зямлёй.

* * *

Косіць вечар промні сонца,
Сцеле долу фарбаў дым.
Снег наўкола, як бясконцасць.
Што ў ім? Згуба альбо ўздым?

Некрануты сум прасторы,
Як паперы чысты ліст.
Збоку — мроі, зверху — зоры.
Снег — падманшчык і артыст.

Ён хавае ў пульхных гурбах
Лёсу дальні серпанцін.
У адценнях, паўфігурах
Свет сыходзіцца на клін.

Але цягне след па снезе
Пратаптаць які ўжо раз,
І па ім, як сонца ўскрэсне,
Адшукаюць нашы нас...

## ІДЗІ!

Ідзі!
Хай будзе шлях шчаслівы.
З табою пойдзе
іншы чалавек,
а мне пакінь,
пакінь ты мне Радзіму —
яе мне хопіць
на астатні век.
Яна не здрадзіць,
і яна паверыць
у слоў адкрытасць
і адкрытасць дум.
Яна мне тайны
вечныя даверыць,
ў якіх я шчасце
простае знайду.
А ты ідзі!
Ружовыя туманы
перад табою
знікнуць спакваля,
і ўбачыш ты
святыя нашы раны,
і зразумееш,
як баліць зямля...

* * *

Гарацць бульбянішчы —
Дымком салёным цягне.
Раскладае восень вогнішчы ў палях.
І так шчымліва, так балюча пахне
Празрысты вечар з сумам у вачах.

Рыпяць вазкі —
з акопак людзі едуць.
Адпачывае шчодрая зямля.
На небасхіле вечнасць паліць свечкі,
І на прастор ліецца цішыня...

* * *

У жніўня вочы затуманены
І белы смутак у вачах,
Бо дні прыгожыя прыпалены
Зжаўцелай фарбай на лістах.

І сэрцу трохі сумна робіцца
Пад звон асенні, залаты.
Вось хутка гэты месяц скончыцца
І зноў прыціснуць халады.

Абрусам белым дол засцелецца,
І ў змроку доўгіх вечароў
Напомніць песнямі мяцеліца
Пра смутак жнівеньскіх лясоў.

* * *

Па свеце колькі ні блукай,
А ўсё адно — усе шляхі
Вядуць у ціхі родны край,
Дзе адпускаюцца грахі.

Пастаўце свечку на акне
Для тых, хто змушаны блукаць,
Хто кожны крок свой лес кляне,
Ужо стаміўшыся шукаць.

Хавае сэнс жыцця жыццё
І ўводзіць нас у штучны зман.
Мы колем душы аб асцё
І рэжам сэрцы аб падман.

Праз гэты выдуманы свет
Імкнёмся делам напрасткі,
І наш амаль нябачны след
Змывае плынь жыцця-ракі…

* * *

Я перад вамі вінаваты,
што парушаю ваш спакой,
Што гавару пра Курапаты,
І пра палын над галавой.

Я вінаваты перад вамі,
што вам ніколі не маніў.
Пад беларускімі сцягамі
Айчыну помніў і любіў.

Не злодзей я, а вы — не судцзі,
хоць і выносіце прысуд.
За костку псіна звягаць будзе,
А кат-судцзя крычаць: «Ату!»

Адзіны суд мне — лёс Айчыны.
І ёй прысвечаны мой шлях.
Пражыць не пасынкам, а сынам
З цяплом і праўдай у вачах...

* * *

Пад сховішчам гаючай цішыні
З-пад мяккае вільготнае зямліцы
Нястомна прабіваецца крыніца
І, як званочак, дзінькае ў гаі.
Каб смагу мог ты ў спёку наталіць,
Вадзіцы той чароўнае напіцца,
Прыродзе мусіш нізка пакланіцца
І ўдзячнай думкай месца асвяціць.

Вось так і душы моцна спяць да часу,
Але прачнуцца і ўзляцяць адразу,
Адчуўшы вуснамі радзіннай мовы смак.
Зноў на Радзіму вернецца сваяк,
І назавецца братам-беларусам
Пакуль што безназоўны мой зямляк.

## ПАМЯЦЬ

Чырвоная стужка на белым фоне,
Як кропля крыві на скуры.
Яна — пекла
І яна — паратунак.
Лычы здраднікаў вытыркаюцца з бруду.
Лікі святых беларускіх
праплываюць сярод аблачын,
Згорбленая бабулька Доля
безнадзейна блукае
на мяжы Расеі і Польшчы.
Дзе тая краіна, што шукала шчасця?
Дзе той народ, які абвясціў, што ідзе?..
...У сховах памяці б'ецца крыніца...
...У сховах памяці жыве надзея...

## ЦЯЖАРНАЯ ДЗІЧКА

Наша сустрэча — нібыта таемная дзея:
Кубачак кавы і лямпы настольнай святло.
Сцяг беларускі пад столлю анёлам бялее,
Печка вясковая нас атуляе святлом.

Ціхія словы. Адкрытасць у сэрцах і душах.
Мова, як пава, плыве ад кута да кута,
А за сцяной перад вокнамі дзічка-ігруша,
Як да каханага,
прытулілася да плата.

Дзічка цяжарная кветам бел-чырвана-белым.
Прыйдзе часіна — як полымя, ўспыхне яна,
Ну а пакуль праз акно яе промнем нясмелым
Грэе пяшчотна настольная лямпа адна...

## *ШЛЯХ СІВОГА ПОПЕЛУ*

* * *

Не трэба смяяцца — я гэтак даўно не іграў.
Струны гітары не слухаюць пальцаў маіх.
У прадажным тэатры я ролю статыста займаў.
І сам не спяваў — толькі слухаў з надзеяй другіх.

Ды другія спявалі зусім не пра наша жыццё,
Выдавалі сябе за пакрыўджаных гэтай зямлёй.
І на сцэне ўсе апраналіся штучна ў рыззё,
Хоць машынамі шчодра дзяліліся нават з раднёй.

Іхні голас зрываўся на крык і раз'юшаны гвалт,
У мелодыях знікла чароўнасць, а ў песнях і сэнс.
Я хварэю, пачуўшы чарговых імён хіт-парад,
Я нямею, убачыўшы песенны секс.

Вы не смейцеся — страшна я доўга маўчаў...
Дайце часу — паслухае пальцаў струна.
Праспяваю — ніколі я так не спяваў,—
Вы пачуеце словы, праўда ў якіх, не мана...

* * *

Душа мая, чаму ты спіш
У час, калі жыццё бунтуе,
Калі сусед ідзе на крыж —
Свой лес Радзіме ахвяруе?

А ты глядзіш на ўсё праз сон,
Павекі долу апусціўшы.
Няўжо не чуеш ты праклён
Людзей, за кратамі пажыўшых?..

А ты, душа? Ты з кім цяпер?
Ў якую казку будзем верыць?
Ідэя, як падбіты звер,
У злобнай міне зубы шчэрыць.

Змаганне ёсць. І вораг ёсць.
І пераможца вучыць ролі.
А ты, душа, спадар ці госць?
Якой жа ты жадаеш волі?

* * *

Крызіс... Эпоха...
Там, за вуглом,
Ева гандлюе прыродным грахом.
Пане Адаме сплюнуў пад лаўку —
Яблык спакусы ляжыць на прылаўку.
Побач цячэ Іарданам народ.
Што? Хрэсны ход?

Ліпнуць да сэрцаў транты, анучы.
Грошы складаюцца куча да кучы.
Як беладонна, буцвее мана.
Бог — Сатана?

Ціха ў храме пустэльным малюся.
Літасці ў Бога прашу Беларусі.
Ціха малюся...
А там, за вуглом,
Ева гандлюе прыродным грахом.

Хутка напоўняцца Божыя соты.
Хто будзе мёдам?

* * *

Чыніцца гвалт:
Раздзяюць прынароднa Свабоду.
Вунь паважны адзін
на грудзях яе гузікі рве.
І крычыць Журналіст:
«Даць Свабоду народу! Народу!»
А ў адказ з мікрафона:
«Дадзім.
Толькa дайце сначала раздзець..

Было пуста наўкол.
І адкуль раптам столькі ўзялося?
Брыдка лаюцца, свішчуць,
і не па-людску вішчаць,
І хапаюць, хапаюць
за рукі, за твар і за косы.
Кожны хоча, як смоўж,
прысмактацца, прыліпнуць, абняць...

А высока ў акне
пазірае праз шыбу Чыноўнік.
Усміхаецца мякка,
бо ведае хуткую ноч.
Тэту Свабоду,
найноўшую гэту Свабоду
Кінудь Чыноўніку ў ложак,
А потым —
адпусцяць пад нож...

## АЗІЯ

Янычары гоняць палон.
Канвойнае сонца ўзнімаецца ўверх
кожны дзень.
Палонныя хочуць піць,
Але іх болей цягне дамоў.
Туды, дзе галосіць вярба,
А тут — ціпчак ды кавыль,
Чужая зямля —
Азія.

Хочацца піць.
Ды, пэўна,
Чужынскія коні п'юць ваду
з празрыстых святых крыніц.
Еўнух мацае потам рук
новых бялявых наложніц.
Цені драўляных багоў
танцуюць у вогнішчах.

Край памірае.
І гэта ужо назаўсёды.
Ніхто не зможа вярнуцца назад.
Спытайце: «Чыя зямля?»
Маўчаць...
Крычыце: «Чыя зямля?!»
Маўчаць...
Паплачце...
Зямля... Зямля...
Азія.

## ЗІМОВАЕ

Белыя-белыя снягі.
Над снягамі блакіт,"
Над блакітам — Сусвет,
Над Сусветам — Бог.

І кожны, хто ідзе па Зямлі,
выбірае для сваёй душы
ці снягі,
ці блакіт,
ці Сусвет,
ці Бога.

І толькі беларусы
мусяць выбіраць
зорку Палын...

## БОЛЬ

Боль...
Чорны тупы боль...
Вочы стаміліся плакаць.
Твары апухлі ад слёз.
Новы адлік Часу.
Час павярнуўся назад.
Будучае — у мінулым.
Чырвона-зялёнае
    ледзь паспела стаць
    Бел-чырвона-белым...
Затое чырвонае
паспела стаць белым.
    Лейкемія...

Чаму ў беларусаў
народныя песні
    такія сумныя?
«Ой, сівы конь бяжыць...»
Белы конь надзеі стаў сівым.
Галасы сяброў — глыткі кароткага шчасця.
Радзее іх кола.
    Белая кроў...
Народы свету, рыхтуйце слёзы —
Вас чакаюць вялікія хаўтуры.
Мы не можам плакаць,
Бо вочы стаміліся,
А твары апухлі ад слёз...
Боль...
    Чорны тупы боль...

* * *

Ноч.
Поўня, як жоўтая птушка.
Профіль анёла.
Трывожныя гукі трубы.

Ноч.
Космасу поўная кружка.
Неразгаданае слова.
Голай жанчыны клубы.

Ноч.
Бела-чырвоная стужка.
Формаю шчасця — падкова.
І маналітам — дубы.

Ноч...

* * *

Вецер зімовы,
Як быццам шалёны,
Вые і вые,
Стогне і стогне.
Могілкі снежныя,
Быццам забытыя,
Моўчкі ляжаць
Сярод сплаканых соснаў..

Дзе агароджа —
Мяжа між часінамі?
Дзе голас памяці —
Крок між стагодцзямі?
Вецер гуляе
Над успамінамі,
Вір забыцця
Доўга ходзіць ў народзе...

Продкі! Паўстаньце
З магілаў і склепаў!
Снег раскапайце,
На свет наш зірніце.
Ў веі загінула
Чыстае неба,
Сонца няма у зеніце!

...Роспач і боль.
І вар'яцкія думкі.

Дзе вы цяпер,
Беларусы?
Можа,
Ў магілах
Халодных і сумных
Спяць вашы думы?

Час падышоў
Мне ад сну ўстрапянуцца,
Скінуць гульню
Папугаеў!
Нам на Радзіму
Трэба вярнуцца,
Мы ж сваю мову маем!

Дзе яна?
Спіць
Пад сівымі курганамі,
У змрочных магілах
Пад веямі снежнымі.
Спіць абламаная,
Спіць абылганая,
Спіць некаханая,
Спіць...
Вечная...

## *ШЛЯХ ШУРПАТЫХ КАМЯНЁЎ*

### НА ЗАМЧЫШЧЫ

На замчышчы — калючая трава.
Вакол вада, трыснёг і плёскат рыбы,
А на карчы — дрымотная сава,
Нібыта высечаная з каменнай глыбы.

Падобна сфінксу, што сярод пустынь
Вартуе сон царыц і фараонаў,
Сава тутэйшая ахоўвае ўспамін
Пра слаўны час віватаў і праклёнаў.

Каторы раз нямая птушка-цень
Зляціць на возера, ў вадзе памочыць пёры.
Ў траве ляжыць пакінуты агмень,
І на расе блішчаць халодна зоры...

### ГАРАДЗІШЧА У АСІНГАРАДКУ

Тут сум вякоў спачыў...
Хавае таямніцы
зямля. Мінае дзень за днём.
У простых справах
губляюцца і сэнс, і мэты спраў.
Здаецца толькі фонам
сівы курган.
Пясок плыве скрозь пальцы...
Ці не вечнасць?
Над могілкамі вечна крумкачы.
Званы маўчаць —
царква ва ўладзе Бога...
Ля крам таўчэцца люд.
Пыліць нудлівы дожджык.
Курган сівее у бялёсай дымцы.
Ледзь чутна стогнуць нетры.
Маўчанне — гэта лес?
Бабулька выцірае слёзы —
прывезлі мала хлеба.
Дождж мацнее.
Чапляюцца ўжо хмары за званіцу.
Насоўваецца вечар.
Ноч
прыпыніць мітусню —
прадоўжыць вечны сон...

* * *

У чорнай ночы мова — немата...
Агні далёкіх вёсак нібы зоркі.
І не чуваць ні смеху, ні гаворкі,
І не відаць ні дрэваў, ні плата.
Сутоннем прыхаваныя узгоркі...
У вільгаці — астылая вада.
У цемры заблудзілася бяда,
Яе прысутнасць — пах палыну горкі.
Яна, як тая гістарычная Арда,
Што вартая асобнае гаворкі,
Ішла, ішла... Але туман, вада,
І не відаць ні месяца, ні зоркі...
Хай сняць сабе маўклівыя узгоркі
Часы, калі гуляла тут Арда.
А мы парадуемся: пах палыну горкі
Згубіла
ў цемры зніклая
бяда...

* * *

Анёл вячэрні запаліць зоры,
Рассыпіе ззянне ў водах Мястра
І зноў цудоўную ноч падорыць
На рэштках замка легендай княства.
Ніхто не бачыў, а я засведчу,
Што роўна ў поўнач у промнях поўні
Я бачыў: постаць ішла са свечкай
Ад рэштаў замка да самай тоні.
І там, на выспе, стаяла доўга.
Глядзела ўдалеч, нібы чакала.
...На хвалі сітнік ляніва шорхаў,
Ды свечку полымя калыхала.
І я успомніў: яна — князёўна,
А князь стагодцзі ідзе з паходу.
Ён час прызначыў — «у поўнач роўна»,
Ды не сказаў вось, якога года.
Таму так часта яна са свечкай
Ідзе да Мястра, стаіць ля тоні.
Ды час не дорыць яе сустрэчай,
І поўня зноўку за краты гоніць.
Я бачыў: постаць ішла да замка,
А потым раптам патухла свечка.
І чуў я: глуха звінела клямка
Ды потым рэхам гукнула вечнасць.
На Мястра ціха злятаюць зоры,
Сыходзіць поўня за лес далёкі.
Па замку восень ідзе дазорам,
І лісце шэпча пра сон глыбокі...

* * *

На Радзіме маёй камяні, камяні...
Яны ў памяць трапляюць з маленства.
Як сівыя дзяды з найбліжэйкіай радні —
Ў іх вялікае ёсць падабенства.

І маўчанне, ў якім запякліся вякі,
І жыццё, што навонку астыла,
Прымушае любіць і лічыць дарагім
Кожны лік, дзе ёсць гонар і сіла.

А каменне расце з неадольнай бяды,
Не з зямлі, а з душы чалавечай,
Дзе атрута прымае выявы яды
І дзе здрада у шкуры авечай.

Ад пакут і знямог камянее душа...
Усё больш камянёў каля поля.
Колькі заўтра іх тут будзе шчыльна ляжаць
Пад наглядам бязлітаснай долі?

...На Радзіме маёй — камяні, камяні...
Гэта — лёс. Гэта — шлях. Гэта — зорка.
Заімшэлі яны ды травой параслі,
Як пабачу, дык робіцца горка...

**САРОКСКАЯ ГАРА**

*М. Кеньку*

Тут ціха...
Так і трэба.
І гэтак блізка неба.
І побач — вершаліны дрэў.
Тут можна
прайсціся асцярожна
і слухаць бесклапотна
птушыны спеў.
Забылася... мінула...
ў зямлі навек заснула
даўнейшае жыццё.
Зірні — усё тут соннае,
і мы з табой палонныя
прыцішаным збыццём.
Тут ціха.
Так і трэба.
Хай спачывае неба
на спінах курганоў.
Мы пойдзем — і навечна
там ціша застанецца.
І доўжа сноў...

## НА КАПТАРУНСКІМ ВОЗЕРЫ

Паганскі край.
Маўкліва курганы,
нібы Атланты,
на плячах трымаюць неба.
Сівыя елкі зеляняць блакіт.
Ў бяздонным возеры жыве яшчэ хімера.
Ля берагоў — ніводнае ладцзі,
бо страшна. Ёсць віры,
якія незнарок ахвяр глытаюць.
Ў вадзе няма слядоў...
На выспах — могілкі і косці
няведама якіх часоў.
Каменне.
Здань мільгае зноў.
Мы толькі госці.
Мы чужынцы тут.
У ноч крычыць нямая птушка.
Ці, можа, гук — паганскі Дух?
І зноў тут цішыня...
Трывожнае маўчанне...
Без ветру ў возеры калышацца вада.
Хто там купаецца ў начным тумане?..
Дзявочы смех...

Адна надзея — вогнішча гарыць.
І маладзік — адзіны са знаёмцаў.
Паганскі край, ты вечна будзеш жыць,
Бо існіна твая — бясконцасць...

* * *

Не хадзі, не гукай,
Мой Сусвет не чапай,
Не буры мой паветраны храм
Я яго будаваў!
Я яго даглядаў!
Я яго разбурыць не дам!

Не малі, не прасі
У яго увайсці,
Бо там месца табе няма.
Там стагодцзі ляжаць,
Там паўсюль — іржа —
І мароз, і сум, і зіма...

Ні табе, ні сабе —
Хай стаіць ува льдзе
Мой каханы трывожны храм!
Сам ў яго не ўвайду,
Каля брамы ўпаду,
А нікому бурыць не дам!

## *ШЛЯХ САМОТНАЙ АДЗІНОТЫ*

* * *

Вецер-бадзяга, вітаю дябе!
Сёння я стаў тваім братам стрыечным.
Шлях мой ляціць між смяротным і вечным
Сэрца — ў выгнанні, душа — у журбе.

Мне не дазволяць знайсці цішыні.
Вечна, як ты, буду ў свеце бадзяцца.
Целам, душой на шматкі разрывацца,
У адзіноце гарэць, бы ў агні.

Хай сабе будзе бязлітасны лес,
Сэрца ўсё роўна калісь разаб'ецца,
Ў вершах душы барэльеф адаб'ецца.
Высахне шлях мой.
Ён мокры ад слёз...

* * *

Мой блізкі чалавек,
глядзі:
гарыць у цемры свечка
для тых,
якія па жыцці
ідуць у вечнасць.

Ратуе іх ад слепаты
узнёсласць,
знішчае стому ад слаты
начная зорнасць.
1м Арыядна дорыць шлях
клубок прароцтваў.
Яны ідуць. Ідуць ад нас.
Ад адзіноцтва.

Бо адзіноцтва — гэта мы,
а з імі — вечнасць.
Мы зачыняемся. Дамы —
як апраметнасць.
Нас напужала ўжо святло
ад свечкі,
нам лепш утульнае цяпло
ля печкі.

Мой блізкі чалавек,
глядзі!
Ідуць жа людзі...
Ужо знікаюць...
Што ў жыцці
тут з намі будзе?..

* * *

Месяц — птах начны...
Трывога
побач з ім ляціць на небе.
Вакол горада — аблога:
вецер... вецер... вецер... вецер...

Ўсё — нічога.
Толькі б сэрца,
толькі б сэрца не астыла,
бо у сэрцы — мая вера,
а у веры — мала сілы...

* * *

У ціхім ручаі — такая пекната!
З нябёсаў аблачынкі зляцелі на ваду,
І быццам бы плыве лябёдак чарада
У дзіўную краіну, куды цяпер іду.

Туды няма дарог. Туды вядзе ручай,
Галінкамі лаза паказвае мяжу.
Навошта мне казаць?
Дарогу ў светлы рай
Нікому нізашто
я больш не пакажу...

* * *

Я адбіваю ў сабе навакольныя дні:
Многа ў іх тлуму і многа крыклівых ідэй
Маці-прырода ніколі не будзе маніць.
Голас вышэйшы нам маніць мацней і мапеей

Птушка-«душа» заляцела у гурт варання.
Каркае жорстка і зверху шукае гніллё.
Птушкі над горадам... ў горадзе многа гаілля.
Усе задаволены? Гэта завецца жыццём?

Гнюсная мань не шукае ўжо болей ахвяр,
Кожны — ахвяра. І кожны хоць раз саграшыў.
Чуеце ў небе нахабна-калючае «Карр!..»?
Слухайце... слухайце...
                    слухайце голас душы...

* * *

Неба...
Лянівая птушка павольна махае крыламі.
Цела і пер'е ляцяць невядома куды.
Мы пазіраем уверх,
                    але вочы — ў тумане.
В ось так і мінаюць гады...

## РУЖА Ў АКНЕ

Студзень... Дождж... Ізноў адліга.
Снег чарнее ад вады.
І туман пануры ціха
Ліжыць сцежкі і сляды.

То варона каркне хрыпла,
То сабака голас дасць.
дзень у змрок сцякае звыкла,
Як на дно ў бузу карась.

Дрэвы ў кроплях выпарэнняў
Плачуць быццам... Час паўзе...
Як надзея.
Як маленне.
Ружа белая ў акне...

* * *

Збяру рукзак — і што далей ад дурняў.
На ціхім возеры у велічным бары
Ля вогнішча ў дымку смалістых курняў
Мне назвінящь сімфоній камары.

Нап'юся водару духмяных траў і лекаў,
Здзяру з душы нагар маны і зла
І зноў сябе адчую чалавекам,
Ў грудзях якога ружа зацвіла.

Тут цішыня. І тут бліжэй да Бога.
І думкі светлыя плывуць, як туманы.
Па зорках добра бачыцца дарога,
Дзе ёсць любоў і дзе няма вайны...

* * *

Далёкае рэха...
Трывожнае рэха...
Нібыта хто кліча...
Але
Куды мне ісці?
Ўсё засыпана снегам.
І свечка дрыжыць на стале.

Маленькае полымя
б'ецца ў абдымках
Халодных начных тумаоў
І золатам ззяе
у зырктх іскрынках
Аконных карцін-вітражоў.

Душы гэтак хочацца
краты пакінуць
І ў снежныя мроі паплыць.
Ды нельга.
Сардэчныя гукі астынуць,
І свечка дашчэнту згарыць...

## НОЧ

Снежная зімняя ноч.
Падае снег,
як матыльковы рой.
Вечнасць была са мной
ўчора.
А сёння — ноч.
Хочаш — сядзі, прароч.
Хочаш — шукай святла.
Там, на краі стала,
свечка калісьці была.
Можна было б паліць.
Толькі навошта?
Жыць
прыйдзецца заутра...
А сёння — ноч.
Снежная зімняя ноч.

* * *

Калі паціхне кроў і змірыцца душа
пад абалонкай цела.
Заўважыць мусіш зноўку адкрыццё:
Жыццё спрамілася і моцна папрасцела.
І ахінае холад пачуццё.

Жывы агонь ідзе у змрок начэй
пад парасон бяздоння.
І промні сыпяцца, нібыта боскі дар.
Абшар зямлі глядзіць на ноч спрасоння.
І пальцы жоўтыя зрываюць каляндар...

* * *

На вясну надзеі мала.
Залягла ў душы туга.
Нешта дыхаць цяжка стала,
Нешта засціць зрок смута.

Плачуць кнігаўкі ў нябёсах,
Дрэмле коцік на вярбе.
Дзень няўтульны ўвесь ў слезах
Снег апошні жорстка рве.

Святы скончыліся летась.
Адзвінеў і сціх ручай.
На каменнях — рваны ветразь,
На душы — туга, адчай.

* * *

А увечары нехта заплача...
Так хочацца лашчыцца сонцам!
А сонца — аранжавы мячык —
Знікае ўжо за гарызонтам.
Я некага словам суцешу,
Скажу, што мы вечныя ў свеце,
Бо нашыя душы ў бязмежжы
Надзеяй у будучым свецяць...

* * *

Сонца ўзыходзіць пазней і пазней.
З птушак вароны адны засталіся.
Яблыкі ўсе на зямлю абтрасліся.
Многа расстанняў і мала надзей.

Кіне зіма свой лядак у ваду,
Вея ля хат заскуголіць тужліва,
Рысачкі крокаў працягнуцца крыва
Ў снежныя мроі, нібыта ў бяду.

Роспачны крык, як у ваце, аглух.
Вечнасць адрэзана белай сцяною.
Толькі адно засталося са мною —-
Зморany, але не скораны Дух...

* * *

Хоць вочы заплюшчы,
ты можаш ісці
Цябе ўсё адно правядуць
Туды, дзе ўсё проста і ясна ў жыцці,
Дзе сумныя людзі жывуць.

І там у будынках
заблудзішся ты,
Сябры прамільгнуць у акне.
І гляне люстэрка, нібыта з труны,
І ты не пазнаеш сябе...

* * *

Здасца раптам, што ты не са мной,
Здасца раптам, што ты не мая,
Што рабіць? Як мне жыць?
Як агонь,
І гарыць, і палае зямля.

Пэўна, й мне не дажыць, а згарэць,
Пэўна, й мне мяккіх слоў не чакаць,
Толькі б гэткага болю не мець,
Толькі б праўды такой не шукаць.

Не чапайце, не рушце агонь,
Паглядзіце — згарае Зямля!
...Мне здалося, што ты не са мной,
Мне здалося. што ты не мая.

* * *

Спакой душы,
чаму цябе няма?
Кароткі лёс
у вочы пазірае,
І сэрца
нешта шчырае губляе,
І нехта кажа,
што жыццё дарма...

А трэба жыць!
Змагацца і гарэць!
І зубы сціснуць.
І ўсміхацца шчыра.
І неабходна
многае паспець,
Пакуль на грудзі
Не сыпнулі
Жвірам...

* * *

Не паспееш падумаць
пра месца сваё пры агні,
А глядзіш — ужо сонца
сыходзіць за межы святла.
І бязлітасны лёс
засыпае пяском карані,
І з вялікай радні
ужо побач нікога няма.

Упіраецца змрок
у бязмежную роўнядзь палёў.
Невыказнай тугой
наліваюцца фарбы душы.
Разумееш тады,
што у процьме знямелых агаёў
Голас свечкі тваёй
адзінока і сумна гучыць...

* * *

«Без пяшчоты няма цеплыні!» —
Гэта зорка гаворыць над полем,
А ў адказ патухаюць агні
На зямлі, што разрэзана болем.

І на неба да зоркі ляціць
Чорны дым абгарэлай пяшчоты,
І у цемры сцюдзёнай дрыжыць
Постаць
чалавекападобнай істоты..

* * *

Б'ецца птушка ў акно,
А за вокнамі — ноч.
Там стыў без цяпла незакончаны дзень.
У мінулым жыцці
*Я* запомніў адно —
Калі цёмна наўкол, то губляецца цень.

Вінаваты не я,
Што за вокнамі ноч
І што птушка спалохана б'ецца у шкло.
Незвычайны скразняк...
Недаплаканы дождж...
Ну чаму так не ў час выключаюць святло?..

**АДЧАЙ**

Вячэрні паўзмрок
і вячэрнія цені...
Мне бачыцца горкая
існасць жыцця:
Крывыя прыступкі
вядуць у скляпенне,
А ў гэтым скляпенні —
труна небыцця.

У змрок вечаровы
гляджу я самотна.
Ні птушак, ні зорак...
І слоў не чуваць.
Бязлюдна-бязлюдна,
халодна-халодна.
Крычы колькі хочаш,
ды нельга крычаць...

* * *

Отпущу свою душу на волю...
Ю. Кузняцоў

Я душу адпусціў —
хай гуляе на волі.
Вось агонь запалю,
каля вогнішча ноч правяду.
Буду зоры лічыць,
буду слухаць заснулае поле
І глядзець, як туман
абдымае нясмела валу.

Недзе ёсць гарады,
ліхтары і кватэры,
Многа розных людзей
і зусім непатрэбных гасцей.
Ды няма цішыні
і няма каму душу даверыць,
І няма яе з кім
да світання
ў туман
адпусціць...

## *ШЛЯХ ХАЛОДНЫХ ПАЦАЛУНКАЎ*

* * *

Я казку табе раскажу,
Ціхую добрую казку
Пра каралеўну адну,
Пра пяшчоту яе і ласку.
Ты слухай мяне і вер,
Што ёсць на зямлі зямля,
Дзе кожны з людзей не звер,
Дзе толькі жыве радня.
Туды я хачу пайсці,
Паклікаць цябе з сабой,
Каб ты у маім жыцці
Была каралеўнай той...

## РАМАНС

Што за ноч за акном — ні цяпла, ні святла,
І апошні агеньчык заснуў у сяле.
Толькі ценем кажан прамільгне у акне,
Толькі сумны чарот прашапоча вадзе:
«Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю
Вас...»

Адышлі, адплылі мроі дзён залатых,
Ты кахаў, і усе так кахалі цябе,
А цяпер уначы -свечкі зніч на стале
І нікога наўкол, хто шапнуў бы табе:
«Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю
Вас...»

Над халоднай зямлёй ў небе зорка гарыць,
І па вуліцах сонных самота брыдзе,
Ды ад саду туман свежы водар нясе
І, цалуючы, шэпча прызнанне расе:
«Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю
Вас...»

Што за ноч за акном — ні цяпла, ні святла.
Залаты успамін у мінуласць вядзе.
Там іскрыцца агонь на азёрнай вадзе,
Там шапоча дзяўчына каханая мне:
«Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас,
Я кахаю Вас...»

* * *

Лёгкі шолах...
Цень жанчыны...
Профіль тонкі...
Павуцінай
змрок вісіць.
Нібыта цемра,
як павук у сетцы-пастцы,
у выяве злога звера
ловіць душы...
Як у казцы,
да святла святло ліецца,
ды між імі —
павуцінне.
Мо таму
шчыміць так сэрца
у такой глухой гадзіне?

...Профіль тонкі...
Зор пыліна.
Лёгкі шолах...
Цень жанчыны...

**НАМАГНІЧАНЫ КОСМАС**

Прыхініся, прашу, да мяне...
Гэты вечар — туга незямная.
Праз фіранку у цёмным акне
Намагнічаны космас сцякае.

Я пагладжу твае валасы,
Пацалую закрытыя вочы,
Каб пазбыцца душэўнай слаты,
Каб пазбавіцца ад адзіноты.

Але подых сусветаў мацней —
Шыба гулка дрыжыць, як жывая.
Галактычнае рэха завей
Нешта тонкае ў сэрцы кранае.

І самотнай здаецца зямля,
І у вечнае вабіць бясконцасць...
Там у ціхіх касмічных палях
Зіхацяцца далёкія сонцы.

...Прытуліся, прашу, да мяне.
Абагрэй, растапі мае сэрца...
Праз фіранку у цёмным акне
Намагнічаны космас ліецца...

* * *

Па-ча-кай, не адыходзь.
За вокнамі — ноч, яна — мой госць.
Яна мае такія сцюдзёныя вочы.
Халодныя пальцы пацiснуць далонь,
Мароз пацалункам ўвап'ецца у скронь,
І думкі бунтуюць, нібыта за імі хто сочыць.

Па-ча-кай, не рві тэты свет.
Навокал цемра. І твой партрэт
Малюе на шыбе самотны мастак Дзед Мароз.
Мне хочацца быць з табой увесь сон,
Аж нават пакуль не скончыцца ён,
Мне хочацца бачыць твой твар без маны і без слёз.

«Не вяр-тай...» — сказала мне ты.
І згінуў свет. І з тла пустаты
З'явіўся плюгавы і сумны міраж адзіноты.
І раптам патухлі усе ліхтары,
І толькі на шыбе малюнак гарыць,
Як сімвал бязмежнай і неабсяжнай тугі і самоты...

* * *

Калі ты спіш
і сон табой гуляе,
Я разважаю вось аб чым:
гульня
І нас з табой то песціць і люляе,
То насылае зграю варання.

І вось яны, крылатыя пачвары,
Дзяўбуць наш розум, сэрцы
і крычаць.
І чорна іх — нібы сышліся хмары,
І цёмна ўсюды — сонца не відаць.

Адкуль бярэцца бляск вачэй сцюдзёных?
Чаму мы словам рэжам да крыві?
...Спі, мілая.
У поцемках замглёных
Хай цябе сон на шчасце блаславіць...

* * *

Мы пойдзем з табою ў туман, каб ніхто
Не змог нас убачыць, не змог адшукаць.
У млечным сяйве гэтак многа дарог,
І краю у гэтых дарог не відаць.

І ў бялёсым тумане блукаць да зары
Ах, якая раскоша, які незвычай!
Што блішчыць там? Ты бачыш? Ў сяле ліхтары?
А мо гэта на нас пазірае адчай?

Ды і што нам з таго?! Ёсць цяпло і туман.
Ўсё заснула, аглохла, у бездань сышло.
Адзіноцтва удвух — ці не лекі ад ран?
Мы прыдумалі гэта? Ці гэта было?..

* * *

Ты сказала, што хутка надыдзе зіма
І пачуцці замерзнуць у скрусе завей,
Што ніякага ўжо паратунку няма
Ад расстання, што рве нас манней і манией,

Што нідзе мы не знойдзем світальнай зары,
Што шляхі нашы крута ідуць пад адхон
І што душы каханнем жылі да пары,
А цяпер над усім і адчай, і праклён.

Ну а я будаваў за палацам палац,
*Я* ішоў да цябе цераз церні і золь,
Ды шляхі завялі на забруджаны пляц,
Дзе нікога няма — толькі роспач і боль...

* * *

Водсвет месяца бурштынам на сцяне.
Распранаецца жанчына.
Для мяне.

Кава выпіта. І свечка аплыла.
Зноў пласцінку музыка знайшла.

Па прамеинях колеру бурштыш
Паплылі размовы, нібы дым.

Іх паклікаў месяц вышынёй,
І бязгучным раптам стаў пакой.

...Толькі профіль тонкі на сцяне
Ды сукенкі шолах ля мяне...

* * *

Стынуць дрэвы белым раннем.
Шэрань кужаль лёгкі выткаў.
Ціхім гулам сон-музыка
Любай грае пра каханне.

Добра спіцца ў зімніх чарах.
Месяц твой спакой вартуе,
А ў той час мароз малюе
На аконных шыбах мары.

Быць шчаслівай гэтак проста:
Спі спакойна да світання,
Сні пра хуткае спатканне,
Пра таго, хто любіць моцна...

* * *

Паглядзі за акно — там у мантыях дрэвы вальсуюць,
Там малюнкі на шкле, а за шклом — маладзік і мароз.
Яны ў гэтую ноч наша ціхае шчасце вартуюць
І варожаць нам светлы, прыгожы і сонечны лес.

Гэты утульны пакой... Гэтай музыкі чыстыя гукі...
Чорны дым валасоў... Невыказная вабнасць вачэй...
Я лячу у Сусвет... Я цалуго дзявочыя рукі...
І агні у вачах да мяне ўсё бліжэй і бліжэй.

Разумею няпер, чаму людзі свой розум губляюць
І чаму вар'яцеюць, калі з імі лашчыцца лес.
Не глядзі на гадзіннік —
там стрэлкі расстанне прарочаць.
Я пайду... Але нас
намалюе на шыбах
мароз...

* * *

Застанемся сябрамі.
Сябраваць, пэўна, лепш, чым кахаць.
Нашы лёсы-жыцці
Паралельнымі пройдуць шляхамі,
Хоць, напэўна, не раз
Так захочацца шлях скрыжаваць!

Раз ты просіш, то хай будзе так.
Меней плётак, хлусні будзе меней.
Я выдатны акцёр і някепскі мастак,—
Ты убачыш, што ў гэтым я геній.

Застанемся сябрамі,
Каб разумна размовы вясці,
Па жыцці
Парапельнымі крочыць шляхамі
І каханне,
Схаваўшы у сэрцы,
Нясці...

* * *

Плыве па Нарачы вянок —
Застаўся ад купальскай ночы.
Ён кінуты рукой дзявочай,
Але мяне знайсці не змог.

І аж да сённяшняга дня
Яго нясуць, ганяюць хвалі.
Хоць з дрэў лісты паападалі,
Ды невядома, дзе зямля.

І дзе дзявочая рука,
Што той вянок пляла з надзеі?
...Мы безнадзейна пасталелі
І развучыліся кахаць...

* * *

Вабіш чароўнай усмешкай...
Зорным трывожным дажджом
Мы галактычнаю сцежкай
У розных сузор'ях ідзём.

Здасца, што мы ужо побач —
Толькі руку працягнуць...
Ценю хістлівага морач
Ледзь паспявае мільгнуць.

Як у хаванкі гуляем...
Зоркі блішчаць на шчацэ...
Я безнадзейна сціскаю
Цень у халоднай руцэ...

* * *

Як толькі убачу знаёмую постаць,
Сціскаецца сэрца, туман наплывае.
Тры месяцы доўжыцца нашая ростань,
А вецер кахання усё не сціхае.

Я выстудзіў цела пад золлю вясенняй,
Прамок пад дажджом — ад маны ратаваўся.
Ды сонца згарэла самотай пякельнай —
Пяшчоты і шчасця я не дачакаўся.

А вецер шугае, спакого не хоча,
Туман у вачах і на шчоках дажджынкі.
А постаць знаёмая весела крочыць.
Гляджу я, гляджу...
А на сэрцы — памінкі...

* * *

Ты пойдзеш — і музыка сціхне,
Зялёныя высахнуць травы,
На небасхіле павісне
Шар безнадзейна крывавы.
Песні птушыныя змоўкнуць,
Струны гітары парвуцца...
Хто нас памірыць, каб зноўку
Мы змаглі ў шчасце вярнуцца?

* * *

Вецер калыску жаданняў люляе.
Што мы знаходзім? Што мы губляем?
Дзень праглынае манюка-туман,
Зрок і пачуцці уводзіць у зман.

Мары не могуць знайсці далячыняў.
Вобмацкам рук да прывідных вяршыняў,
Студзіць туман закіпеўшую кроў.
Гасне любоў...

* * *

Не плач, апаленае сэрца!
Не парушай паток крыві
І мужна жар душы нясі
На аўдыенцыю да смерці!

Яшчэ прыгожыя жанчыны
І рана думаць пра крыжы...
Цвіце валошка на мяжы,
І ёсць для радасці прычыны...

* * *

Возера лясное. Восеньскія пахі.
Сонечныя пасмы мяккіх валасоў,
А над лесам неба, як з блакітнай бляхі,
А пад лесам царства хмельных верасоў.

І была часіна — тут гулялі двое,
Складвалі зялёнкі у агульны кош...
Паглядзі, дзяўчына, гэта ж мы з табою,
Гэта нас малюе сонцалікі дождж.

Не, не дагукацца. Ростані... Дарогі...
Возера лясное скута зімнім сном.
Як, скажы мне, выйсці з гэтае аблогі —
Ўсё гарыць-палае снегавым агнём.

Ці святкую нешта, ці аб чым сумую,
У вачах зімовых — той асенні дзень.
Мы ідзем праз казку, казку залатую,
І такім нязграбным выдаецца цень...

* * *

Палацы Снежнай каралеўны
Вартуе пільна завіруха.
Там стыне кроў.
Жывога духу
Няма.
Адны сцюдзёныя напевы.

На льдзянай скрыпцы грае сумна
Музыка,
Ён адзін застаўся.
У каралеўну закахаўся...
У лёд...
А жыў жыццё разумна.

О лёд! Якая чысціня!
Якая бездань для гармоній...
У ідэальнай абалоні
Няма ні каліва жыцця.

Агню баіцца чысты лёд...
Музыка слоў не разумее.
Ён адчувае, што хварэе,
Але іграе з году ў год.

Хто каралеўне прысягае,
Хто слепа верыць чысціні,
Той не згарае на агні.
І не жыве.
А сумна грае...

* * *

Вы дужа часта сталі сніцца мне.
Я толькі ў снах бываю з Вамі побач,
А як пабачу — толькі сум і роспач
Агортваюць, як воблакам, мяне.

Вось бы змяніць жыццёвы тлум на сон.
Якім бы колерам тады цвіло каханне!
Такая ноч! Ад змроку да світання
Пасцель гарачая і схаладнелы трон...

* * *

Запаліце мне ціхую зорку,
Каб уночы надзейна гарэла.
Падарыце мне з сябрам гаворку,
Каб да зоркі душа узляцела.
Раскладзіце агонь у каміне,
Каб цяплей было сэрцу і промню.
...Нас пад раніцу зорка пакіне,
Але я яе ўвечары усномню...

## КАСЦЁЛ СВЯТОЙ ГАННЫ

Ёсць у Вільні касцёл.
Яго вежы ірвуцца да неба,
Як каханне, якому прытулак — Сусвет.
Ён для тых, каму вера
У дні развітальныя трэба.
Ён для тых, каму клінам
Сышоўся рамонкавы свет.

Тут на раны душы
Льюць самотныя гукі арганы.
Тут паломнікі шэпчуць
імёны каханых сваіх.
І ўзлятае пад купал —
«Святая заступніца Ганна,
Веры дай у любоў,
да кахання святога вярні...»

У натоўпе людзей
пад абраз сваю свечку пастаўлю,
Прашапчу, як і ўсе,
імя любай дзяўчыны сваей,
Перад Богам яе
у касцёле чырвоным услаўлю,
Папрашу аб спагадзе,
заступніцтве Ганны святой.

Адзавецца касцёл,
і у рэху імя адгукнецца.
У гуках ягоных
я пачую тады
Мілы шэпт, як трымценне
каханага блізкага сэрца —
«...анна анна...»
І ціха заплачуць званы.

* * *

Я Вас кахаю...
Так, я Вас кахаю.
— За што? — пытаеце...
Ды ні за што, а так...
Вось так, як я жыву,
Як верш для Вас складаю.
В а ўсім -— глыбокі сэнс.
На ўсім — таемны знак.

Нам сэрца Богам дадзена...
Жыццё нам Богам дадзена,
Каб мы каханнем мерылі
Штодзённа прыгажосць,
Бо тое ўсё нявечнае,
Што у душы украдзена,
І там, дзе няма шчырасці,
Заўжды пануе злосць.

— Як дзіўна Вы гаворыце...
Як у царкве, гаворыце...
Напэўна, Вы і верыце,
Што ёсць на свеце Бог?
— Канешне... Гэта ж — ісціна.
У гэтым шумным горадзе
Без Бога і без любасці
Знайсці б я Вас не змог...

Калі ў каханне верыце.
То Вы і ў Бога верыце...

## *ШЛЯХ ЗАПОЗНЕНАГА ПАКАЯННЯ*

* * *

У бязмежнай прасторы, дзе вецер і золь
І дзе чорнымі фарбамі змазаны свет,
Нібы сэрца гарачае, б'ецца агонь
Ад той свечкі, якую пакінуў паэт.

Не кажыце, што вецер задзьмухне святло,
Што дажджом заліе астравок цеплыні.
Не кажыце... Я ведаю добра адно —
Без такога агню не пражыць на зямлі.

Пакуль вера ў душы гаспадыняй жыве,—
Не патухне агонь у бязмежжы палёў,
І чарговую цемру святлом узарве
Тая свечка, якую запальвае кроў.

* * *

Мараль.
Умоўнасці.
Законы.
Як павуціннем, чалавек
апутаны.
І так — да скону.
Кароткі век.
Бясконцы век.

І як дзівацтва — незвычайнасць
ўзрывае свет
аж на шматкі,
ляціць у прорву
аднастайнасць,
мяшае хвілі
і вякі.
І адчыняюцца прасторы,
якіх не ведала
душа.
Святло нябеснае.
І зоры.
І таямнічы сэнс
крыжа.
А сэрца слухае бясконцасць
і прагна ловіць
кожны гук.
Мараль.
Законнасць...
Умоўнасць.
Цякуць
скрозь стрму пальцаў рук...

* * *

«Бог пайшоў»,— сказаў адзін
　　　і піў гарэлку.
«Бог са мной»,— сказаў другі
　　　і стаў маліцца.
Пачарнела на зямлі
　　　ад напояў,
Пасвятлела на душы
　　　ад малітваў.

* * *

Разарвіце цяжкія путы,
Адпусціце мяне на Волю!
Чаму я да Зямлі прыкуты
Чалавечай самотнай доляй?

Чаму я не магу Анёлам
У святло паляцець шчасліва?
...Вые вецер у полі голым,
І ўсміхаецца месяц крыва...

* * *

Вочы халодныя, кроўю абмытыя,
Думкі карэлыя, мары драпежныя.
Мы гэта, людзі, здзічэлыя, грэшныя,
Злом ачмурэлым да краю налітыя.

Нашыя словы, як джалы, балючыя.
Зайздрасцю сэрца да стогнаў сціскаецца,
Можа, таму, што жыццё надакучыла
І Сатана у душы вычвараецца?

Дзе вы, анёлы сумлення і радасці?
Дзе ты, прытулак душы незапэцканы?
Прага бяздушнасці, смага вар'яцкасці.
Той — недавучаны... Той — недасведчаны.

...З неба ліецца святло запаветнае.
Свет і паветра любоўю напоўнена.
Радасць бясконцая, чыстая, ветлая...
...Не заўважаем...

* * *

Палявую кветку
не садзіце ў садзе,
Не садзіце ў клетку
птушачку жывую,
Не даруйце людзям,
што былі у здрадзе,
Не мілуйце дзевак,
што былі у блудзе.
Перад вечным светам
мы ў адказе вечным.
Нам зімой і летам
даражэй святло.
Пазірае цемра
зверам небяспечным,
І чакае здрады
неспатольна зло.
Да святла я клічу
кожны дзень — упарта,
Кожны дзень на бітве
узнімаю сцяг.
І ўжо йдуць за мною
ўсе, што Волі варты.
Ёсць ужо пачатак —
будзе шчэ працяг!
Толькі не кідайце
сэрцы у лядоўню,
Толькі не прадайце
за даляр душу.
Толькі не разрэжце
на кавалкі поўню.
Толькі не маніце.
Я вас так прашу...

* * *

Жоўтая лямпа падобна на Сонца.
Я падобны на Бога,
Бо магу запаліць і патушыць
Святло...

* * *

Свечкі гараць у храме.
Там людзі прыйшлі да святла.
А я са сваёю свечкай
іду у змрок.

Дрыжыць і трапечыцца ў далонях
жывы агеньчык.
Чыстыя водблескі
парушаюць цемру
і даюць магчымасць бачыць.

Я рады, што ёсць людзі,
якія увайшлі у храм.
Я скрушны, бо многа людзей
шчэ блукае у цемры.

Вось таму я выйшаў з храма,
каб сваёю свечкай
высвеціць
змрок.

## ПАД ПРОМНЯМІ ЗОРАК

Промень першай зоркі
змог з нябёс праліцца.
Чалавек у поле
выйшаў памаліцца.
Памаліцца шчыра
за жыццё на свеце,
за святло ад зорак
і за ў полі вецер,
за ручай у лесе
і за спевы птушак,
за карову ў хлеве
ды за дзвюх цялушак,
за каханне з жонкай,
што навек спачыла,
і за шчасце дочак,
што яго забылі.
...Чалавек у полі
шчыра памаліўся —
промень сёмай зоркі
на зямлю праліўся...

## ВЫЙДЗІ ДА НЕБА

Выйдзі да неба,
адчуй непазбежнасць прасторы,
Слухай сабой
цішыню кананадных вышынь.
Гэты спакой,
што ў табе маналоп гаворац,
Толькі фантом...
Ён ланцуг на шляху да вяршынь.
Вырві яго,
як халодную жабу ад сэрца.
Промнем ідзі —
цябе выведзе ў вечнасць святло.
...Лёгкі твой конь
адзічэла на ржышчы пасецца,
І у калодзежы
зубы ашчэрыла тло.
Змрочныя сілы
чакаюць упарта падзення,
Пасткі-пячоры
ўжо шчымяцца нават у сны.
Хіба ж не чуеш,
як хрумскаюць сэрца сумненні?
Хіба ж не п'еш ты
штодзённую каву маны?
Досі сядзець!
Паспяшайся да зорнага неба!
Шлах у прасторы
пакажа духоўны агонь.
Толы і вазьмі ты скарынку жытнёвага хлеба,
І да цябе
зноў падыдзе здзічэлы твой конь...

* * *

З прасторы зорнае нябёс
Ідзе да нас Ісус Хрыстос.

Ліецца дзіўнае святло,
Гарыць агонь, і гіне тло.

І з тых даўно забытых слоў
Я ўспамінаю: «Бог — любоў!»

Пра гэта трэба гаварыць —
Я жыў! Жыву! Я буду жыць!

Гасподзь даруе мне ізноў
Адвечнасць ісціны — любоў.

І мне ісці праз гэты свет,
Нясці святло, як запавет,

І крыж нясці праз шлях зямны
Туды, дзе вечна б'юць званы.

Адтуль, скрозь зорны дах нябёс,
Ідзе да нас Ісус Хрыстос.

* * *

Адгукаецца мне далячынь...
Слава Богу, шапчу, слава Богу...
І праменне з нябесных вяршынь
Асвятляе у цемры дарогу.

Крыж Паўночны па зорах знайду,
Памалюся аб вечным у вечнасць
І па ўласнай дарозе пайду
Да шляхоў, што сыходзяць у млечнасць.

Там дзівосны агонь таямніц...
Там такая мелодыя льецца...
У бяздонні касмічных крыніц
Рэха сонцаў далёкіх смяецца.

Сэрца лёгка ляціць праз эфір,
У святле зіхаціцца праменнем,
І зямлёй перапоўнены мір
Пераходзіць у фазу гарэння.

Божа мілы! Мяне не пакінь!
Хай удзячнасцю стане трывога...
...Адгукаецца мне далячынь,
І святлее у цемры дарога...

## *ШЛЯХ КРЫНІЧНАЙ ЧЫСЦІНІ*

* * *

Усю ноч за акном цішыня —
Там пануе суцэльны спакой.
У бясконцых касмічных палях
Зоркі легка плывуць...
                    І са мной
У пакоі, дзе лямпа гарыць,
Дзе гадзіннік адлічвае час,
Ёсць жаданне вялікае — жыць
Гарманічным святлом...
                    Яшчэ б раз
Прадзяўбці шкарлупу ад яйка,
Пылюком зноў убачыць святло
Ці адчуць, як вясною рака
Нясе трэскай у мора...
                    Сцякло
Шмат вады са сцюдзёных крыніц,
Што вярнуліся зноўку з дажджом.
...Ад напоўненых кніжных паліц
Пахне мёдам жыцця...
                    Толькі сном
Выдаецца далёкая смерць.
І падчас, калі зорка ляціць,
Я так прагна хачу зразумець,
Чаму гэтак жадаецца жыць...

* * *

Снежная роўнядзь...
Сонца ў марозным тумане.
Шэрань іскрыцца
    халодным празрыстым святлом.
Веска у гурбах,
    нібыта ў зімовым капкане,
Грэе нябёсы
    прыемным смалістым дымком.

Дзынкне вядро
    аб лядовую плойміну студні,
Рыпнуць вароты,
    пад санкамі снег захрумсціць,
І ад дарогі да возера
    пойдуць са скрынямі людзі
З тайнай надзеяй
    вялікую рыбу лавіць.

Ў звонкім паветры
    блішчаць пералівам сняжынкі.
Зіхкі, як мара,
    туман на марозе вісіць.
Сыпяцца ў сэрца,
    як кропелькі шчасця, іскрынкі...
Што ні кажыце,
    а добра ля Нарачы жыць...

* * *

Спі, прырода... Яшчэ рана
Адмыкаць Лядовы панцыр.
Сонца моны не набрала,
Каб узняць пратуберанцы.

Яшчэ дрэвы спяць салодка,
Мрояць летнія убранні.
Рыбакова дрэмле лодка,
Вёслы сушацца ля лазні.

Ды і сам рыбак ля печы
Нерат новы абшывае.
Жмурыць вочы ранні вечар,
Рыбаку дабра жадае.

А на небе — месяц, зоры,
А ля хаты — холад, вея,
У жыцці, дзе многа гора,
Ёсць маленькая надзея,

Што пад панцырам Лядовым
Веснавое сэрца б'ецца.
...Можа, ў некім гэта слова
Светлым рэхам адаб'ецца...

* * *

Раскошныя ночы бываюць зімою:
У зоркавых бліскаўках ззяюць сады,
І чорнае неба, і снегу сувоі,
І ў ціхіх самотных агнях гарады.

У хітрым спляценні штодзённага шалу,
Ў пагоні за прывідам штучных надзей
І спраў гэтак многа, і часу так мала
На неба, на сад, на сябе паглядзець.

Імчыцца вар'яцкая стужка стагоддзя
І нас у самотныя хвалі нясе.
А недзе далёка-далёка на Ўсходзе
Сузор'е, як ружа, цвіце.

## ВЕЯ

Як у светлым танцы белыя сняжынкі,
У мазурках веі лётаюць, блішчаць.
І, нібы ўсмешкі, зыркія іскрынкі
У аконных шыбах ярка зіхацяць...

Па пустынных вулках, каля хатаў сонных
Каралеўны Лёду выпраўляюць баль.
Па законах свецкіх, звычаях салонных
Ў кожнай прыгажуні на вачах — вуаль.

Зноў мяняе майстра формы дэкарацый:
Белыя калоны, замкавы вітраж.
Пырскамі ўзлятае сноп ілюмінацый.
Побач з Каралеўнай — яе мілы Паж.

Вось ізноў завея закружыла ў танцы,
Але ж на імтненне паказала нам,
Як на белым ложку гурбы-абарванцы
Хутка распраналі беласнежных дам...

* * *

У трыснягах заўзята крэкчуць качкі,
Садзіцца сонца ціха за гару,
І сок бярозавы, прачнуўшыся ад спячкі,
Струменіць кроплямі на белую кару.

Пяшчотна радасць лашчыцца ля сэрца,
Нябёсы вішняй спеюць на зары.
Саната ціхая над возерам ліецца
І замаўкае недзе у бары.

Смалісты пах крывой сасны убогай
Прастору вечара і лечыць, і п'яніць,
І над пустой, астылаю дарогай
Маркотны лунь кудысь ляціць, ляціць.

...У трыснягах ужо прыціхлі качкі.
Сутонне туманы над возерам пасе.
І сок бярозавы, што бродзіць пасля спячкі,
Сцякае з дрэва
і губляецца ў траве...

* * *

Ля возера Доўжа — гаючая ціша,
Мядовыя травы і водар духмяны.
Лянівая хваля люстэрка калыша,
З балотаў да возера льюцца туманы.

У гэтую казку увойдзе не кожны,
Вячэрнія песні не кожны начуе.
О, як жа тут пахнуць смалістыя сосны!
О, як тут салоўка над песняй шчыруе!

Хай нехта не любіць прыгожыя словы,
Хай нехта прывык да праклёнаў і матаў,
А я ачышчаюся пахам вясновым,
А я яшчэ веру і людзям, і травам.

На чыстыя гукі душа адгукнецца,
І здасца жыццё і прыгожым, і вольным.
...Над возерам Доўжа адкрытае сэрца
Ляціць, нібы птушка над зорным вуголлем.

* * *

Спахмурыцца дзень, як стары чалавек,
Накіне на плечы руды дажджавік
І пойдзе ля рэчышчаў высахлых рэк
Туды, дзе яшчэ не струхнелі багі.
Ён думкі мае павядзе за сабой,
Бо іх, як душу, трэба зноўку свяціць.
Бліскучыя бляшкі накрыла іржой,
А золата недзе у сховах ляжыць...

* * *

На Баторыне — туман ды туман,
Трыснягі вядуць размову з вадой.
І, здаецца, недзе грае арган,
Гэтак грае, нібы плача слязой.

Можа, ў мядзельскім касцёле імша,
Можа, проста лёгкі ветрык гуліць,
Ну, а можа, з сэрца злазіць іржа
І таму яно так шчыміць-баліць?

Што я ведаю пра свой родны край?
І чаму мяне так цягне сюды?
Мо таму, што ён падобны на рай
У адзінстве лесу, зор і вады.

І таму яшчэ, што тут цішыня
І што добрых тут людзей больш чым дзе.
З імі можна нашы песні пяяць
Ды за чаркай пасядзець ў грамадзе...

Як бярэ за сэрца дзіўны арган!
І стаіш тады нібы сам не свой.
На Баторыне — туман ды туман,
На вачах ён асядае слязой...

* * *

Іграла жанчына
Скляпеннямі залы
шчымлівае рэха
гукала да Бога.
На крылах мелодый
душа узлятала.
і ярка свяцілася
ў неба дарога.
І плавіўся дах.
адчыняючы сонца.
ды шэрыя сцены
кудысьці знікалі.
Касмічнай прасторай
зіхцела бясконцасць.
і вусны малітву
аб вечным шапталі.
а сэрцу, якому
абдымкамі плоці
лунаць забаронена
ў сферах узнёслых.
балюча рабілася..
Толькі на ўзлёце
ў адзінстве злучаюцца
шчасце і слёзы...
Іграла жанчыша...
Без дахаў, без залы
мелодыя ціха
над светам лунала.
Ласкавым звярком
пасля шчасця узлётаў
душа каля сэрца
ляжала пяшчотай...

* * *

Мы слухаем словы, а сэрцаў не чуем,
Мы словы гаворым, а сэрцам маўчым,
Жывое, святое ламаем, руйнуем,
Ад чуласці, быццам ад смерці, бяжым.
А потым самотна глядзім на нябёсы
І жалімся блізкім на хмурнасць жыцця,
А ў гэту часіну на сонечным плёсе
Шчаслівыя качкі плывуць ля трысцяг.
Ёсць сонца, вада і нябёсаў бязмежжа.
Што трэба ім болей на гэтай зямлі?
А мы? Мы гаворым пра стравы ды ежу
І самі сабе прадаўжаем маніць...

* * *

Ціхі вечар над возерам.
                    Зоры ў вадзе.
І стагодцзі, бы качкі, плывуць.
І чарговая ноч па Радзіме ідзе —
Ўсё імкнецца у твар зазірнуць.

Ну, глядзі...
        Я сягоння адкрыты у свет.
Я гатовы гармонію сэрцам лавіць.
Я збіраю ў душу
        кожнай зорачкі след,
Каб у вершах
        чароўны агонь адрадзіць.

* * *

Не ўсе шляхі дазволена прайсці —
Свядомасці прастор абмежаваны.
Ў адказ на спробу ісціну знайсці
Хтосьці зрывае рэзка ўсе стоп-краны.

І думкі патрапляюць у сіло
І б'юць адчайна крыламі да змогі.
Ды лёс такі...
І клетка — іх жытло.
Для новых думак — новыя дарогі.

Няма ні вечных кратаў, ні шляхоў.
Адбудзецца, чаму ўжо час адбыцца.
...З глыбінь касмічных і з вышынь вякоў
Ляціць святло, каб думкамі праліцца...

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год

**ЗМЕСТ**

*К. Камейша.* «З цяплом і праўдай у вачах...»

***ШЛЯХ ЗАСНЕЖАНАЙ АЙЧЫНЫ***
«Радзіма...»
Настальгія
«Я паліваю вадою каменне і цэглу...»
«Косіць вечар промні сонца...»
Ідзі!
«Гарачь бульбянішчы...»
«У жніўня вочы затуманены...»
«Па свеце колькі не блукай...»
«Я перад вамі вінаваты...»
«Пад сховішчам гаючай цішыні...»
Памяць
Цяжарная дзічка

***ШЛЯХ СІВОГА ПОПЕЛУ***
«Не трэба смяяцца — я гэтак даўно не іграў...»
«Душа мая, чаму ты спіш...»
«Крызіс... Эпоха...»
Гвалт
Азія
Зімовае
Боль
«Ноч. Поўня, як жоўтая птушка...»
«Вецер зімовы, як быццам шалёны...»

***ШЛЯХ ШУРПАТЫХ КАМЯНЁЎ***
На замчышчы
Гарадзішча ў Асінгарадку
«У чорнай ночы мова — немата...»
«Анёл вячэрні запаліць зоры...»

«На Радзіме маёй камяні, камяні...»
Сарокская гара
На Каптарунскім возеры
«Не хадзі, не гукай...»

***ШЛЯХ САМОТНАЙ АДЗІНОТЫ***

«Вецер-бадзяга, вітаю цябе!..»
«Мой блізкі чалавек, глядзі...»
«Месяц — птах начны...»
«У ціхім ручаі — такая пекната!..»
«Я адбіваю ў сабе навакольныя дні...»
«Неба... Лянівая птушка павольна...»
Ружа ў акне
«Збяру рукзак — і што далей ад дурняў...»
«Далёкае рэха... Трывожнае рэха...»
Ноч
«Калі паціхне кроў і змірыцца душа...»
«На вясну надзеі мала...»
«А увечары нехта заплача...»
«Сонца ўзыходзіць пазней і пазней...»
«Хоць вочы заплюшчы, ты можаш ісці...»
«Здасца раптам, што ты не са мной...»
«Спакой душы, чаму цябе няма?..»
«Не паспееш падумаць пра месца сваё пры агні...»
«Без пяшчоты няма цеплыні!..»
«Б'ецца птушка ў акно...»
Адчай
«Я душу адпусціў...»

***ШЛЯХ ХАЛОДНЫХ ПАЦАЛУНКАЎ***

«Я казку табе раскажу...»
Раманс
«Лёгкі шолах... Цень жанчыны...»
Намагнічаны космас
«Па-ча-кай, не адыходзь...»
«Калі ты спіш...»
«Мы пойдзем з табою ў туман, каб ніхто...»
«Ты сказала, што хутка надыдзе зіма...»
«Водсвет месяца бурштынам на сцяне...»
«Стынуць дрэвы белым раннем...»
«Паглядзі за акно — там у мантыях дрэвы вальсуюць...»
«Застанемся сябрамі...»
«Плыве па Нарачы вянок...»
«Вабіш чароўнай усмешкай...»
«Як толькі убачу знаёмую постаць...»
«Ты пойдзеш — і музыка сціхне...»
«Вецер калыску жаданняў люляе...»
«Не плач, апаленае сэрца!..»
«Возера лясное. Восеньскія пахі...»
«Палацы Снежнай каралеўны...»
«Вы дужа часта стапі сніцца мне...»
«Запаліце мне ціхую зорку...»
Касцёл святой Ганны
«Я Вас кахаю...»

***ШЛЯХ ЗАПОЗНЕНАГА ПАКАЯННЯ***

«У бязмежнай прасторы, дзе вецер і золь...»
«Мараль. Умоўнасці. Законы...»
«Бог пайшоў»,— сказаў адзін...»
«Разарвіце цяжкія путы...»
«Вочы халодныя, кроўю абмытыя...»
«Палявую кветку не садзіце ў садзе...»
«Жоўтая лямпа падобна на Сонца...»
«Свечкі гараць у храме...»
Пад промнямі зорак
Выйдзі да неба
«З прасторы зорнае нябёс...»
«Адгукаецца мне далячынь...»

***ШЛЯХ КРЫНІЧНАЙ ЧЫСЦІНІ***

«Усю ноч за акном ціішыня…»
«Снежная роўнядзь…»
«Спі, прырода… Яшчэ рана…»
«Раскошныя ночы бываюць зімою…»
Вея
«У трыснягах заўзята крэкчуць качкі…»
«Ля возера Доўжа — гаючая ціша…»
«Спахмурыцца дзень, як стары чапавек…»
«На Баторыне — туман ды туман...»
«Іграла жанчына…»
«Мы слухаем словы, а сэрцаў не чуем…»
«Ціхі вечар над возерам…»
«Не ўсе шляхі дазволена прайсці…»

Пракаповіч І.

Шляхі наканаванага бязмежжа: Вершы/ Прадм. К. Камейшы.— Мн.: Маст. літ., 1999.— 111 с.— (Першая кніга паэта).

ISBN 985-02-0246-7.

Паэтычны голас Ігара Пракаповіча, можа, не такі ўжо гучны, але гата свой, непаўторны голас. Сведчанне таму — гэта кніга. Яна найперш заклікае чытача не толькі любіць родную зямлю, але і імкнуцца душою ў Божы храм, як самую найвялікшую нашу надзею...

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год